# Скарб XVII ст. з вёскі Гарошкі Мінскага раёна са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

**Віталь СІДАРОВІЧ**



Дзяржаўная ўстанова «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: wital.sidarowicz@gmail.com

Скарб знойдзены ўвесну 1965 г. у в. Гарошкі Мінскага раёна падчас пасадкі бульбы на глыбіні 30 см. Манеты знаходзіліся ў алавянай пасудзіне, якая месцілася ў скрыні з драўляных дошак. Частка манет разышлася па руках (колькасць гэтых манет нам невядома). Жыхарка г. Мінска Ніна Нікіфараўна Крыванос передала 3 чэрвеня 1965 г. у Дзяржаўны музей БССР 4 555 манет. Іх першаснае вызначэнне было праведзена навуковым супрацоўнікам Л.Д. Клокам.

Перад апісаннем складу скарбу варта паведаміць крыху інфармацыі па гісторыі вёскі Гарошкі. У сярэдзіне XVII ст. гэта вёска адносілася да Заслаўскага графства і, адпаведна, належала Глябовічам. Самы ранні архіўны дакумент па Заслаўскім графстве ў Нацыянальным гістарычным архіве датуецца 1698 г. Гэта інвентар, складзены пры перадачы Заслаўскага графства стольнікам ВКЛ Ежы-Станіславам і яго жонкай Ізабэлай (народжанай Палубінскай) Сапегамі ў арэнду скарбнаму ВКЛ Яну Шрэтэру. Па стане на 1698 г. Гарошкі былі зямянскай вёскай на 17 двароў і 23 валокі зямлі. Адміністратыўна Гарошкі адносіліся да Ломшынскага войтаўства Заслаўскага графства [1][1].

Скарб з вёскі Гарошкі ўражвае сваімі памерамі. Нават захаваная частка дазваляе адносіць яго да буйнейшых па колькасці манет скарбаў XVII ст., а з улікам страчаных манет ён увогуле мог быць адным з найбуйнешых дэпазітаў гэтага часу. У калекцыі скарбаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь дэпазіт з в. Гарошкі[2] мае найбольшую колькасць адзінак захавання. На працягу некалькіх гадоў аўтарам праводзілася навуковае апісанне і ўдакладненне вызначэння манет Гарошкаўскага скарбу. Кароткія вынікі гэтай працы прадстаўлены ў дадзеным артыкуле.

Большую частку Гарошкаўскага скарбу складаюць эмісіі Рэчы Паспалітай (2 581 экз.), сярод якіх абсалютна дамінуюць манеты Жыгімонта III Вазы (1587–1632), прадстаўленыя амаль усімі дробнымі і сярэднімі наміналамі таго часу – ад двудэнарыя да шасціграшовіка.

Драбнейшыя наміналы – двудэнарый, тэрнарыі, шэлягі і грошы – складаюць адносна невялікую (165 экз.), але выразную групу сярод манет Рэчы Паспалітай. Найдрабнейшым сярод іх з'яўляецца літоўскі двудэнарый 1620 г. Тэрнарыі (15 экз.) прадстаўлены выключна прадукцыяй прыватных манетных двароў Лабжэніцы і Познані *(табліца 1)*[3].

Сярод шэлягаў Жыгімонта III Вазы *(табліца 2)* пераважаюць манеты віленскай чаканкі (65 экз.). Манеты Рыжскага манетнага двара прадстаўлены 21 экз., а самымі нешматлікімі з'яўляюцца каронныя шэлягі (8 экз.).

Манет наміналам у грош – 47 экз. *(табліца 3)*. Сярод іх амаль пароўну каронных і літоўскіх (з невялікай перавагай апошніх). Найменшую групу сярод грошаў складаюць эмісіі Гданьска.

*[1] Шчыры дзякуй Яўгену Глінскаму за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтага артыкула.*

*[2] Акт прыёму на пастаяннае захаванне № 1944 ад 16.09.1965, КП 17030.*

*[3] Частка гэтых манет была вызначана Л.Д. Клокам як шэлягі. Памылковае вызначэнне абумоўлена, верагодна, вельмі дрэннай захаванасцю манет.*

Табліца 1

**Тэрнарыі Жыгімонта III Вазы**

| | Лабжэніца | Познань |
|---|---|---|
| **1625** | 1 | |
| **1626** | | 1 |
| **1627** | 4 | 1 |
| **1630** | 4 | |
| **1630?** | 1 | |
| **Дата?** | 3 | |
| **Усяго** | **13** | **2** |

Табліца 2

**Шэлягі Жыгімонта III Вазы**

| | Літоўскія | Кароння | Рыжскія | Ман. двор? |
|---|---|---|---|---|
| **1604** | | | 1 | |
| **1606** | | | 1 | |
| **1609–1619** | | | 3 | |
| **1610–1619** | | | 2 | |
| **1613** | | 2 | | |
| **1614** | | 1 | | |
| **1615** | | | 1 | |
| **1616** | 1 | | | |
| **1616?** | | | 1 | |
| **1618** | 2 | | | |
| **1619** | | | 1 | |
| **1620** | | | 3 | |
| **1620?** | | | 1 | |
| **1620–1621** | | | 1 | |
| **1621** | | | 4 | |
| **1621?** | | | 1 | |
| **1622** | | 1 | | |
| **1623** | 24 | 2 | | |
| **1623?** | 3 | | | |
| **1623–1625** | 1 | | | |
| **1623–1627** | 2 | | | |
| **1624** | 17 | | | |
| **1625** | 1 | | | |
| **1626** | 6 | 2 | | |
| **1627** | 8 | | | |
| **Дата?** | | | 1 | 1 |
| **Усяго** | **65** | **8** | **21** | **1** |

Табліца 3

**Грошы Жыгімонта III Вазы**

| | Літоўскія | Кароння | Гданьскія |
|---|---|---|---|
| **1604?** | | 1 | |
| **1623** | | 2 | |
| **1623–1625** | 3 | 2 | |
| **1624** | | 11 | |
| **1625** | 3 | | 4 |
| **1625?** | 1 | | |
| **1626** | 6 | | 4 |
| **1626?** | 2 | | |
| **1627** | 6 | 1 | 1 |
| **Усяго** | **21** | **17** | **9** |

Табліца 4

**Каронныя паўтаракі Жыгімонта III Вазы**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1616** | 1 | **1624** | 447 |
| **1617** | 1 | **1624?** | 1 |
| **1619** | 3 | **1625** | 365 |
| **1620** | 79 | **1625?** | 6 |
| **1620?** | 2 | **1626** | 102 |
| **1621** | 186 | **1626?** | 4 |
| **1621?** | 3 | **1627** | 48 |
| **1622** | 428 | **1627?** | 2 |
| **1622?** | 7 | **1616–1625 (герб Сас)** | 2 |
| **1623** | 531 | **1620–1625 (герб Сас)** | 37 |
| **1623?** | 10 | **1625–1628 (герб Паўкозіц)** | 3 |



*Малюнак 1*

Сярод эмісій Жыгімонта III Вазы дамінуюць паўтаракі, якія складаюць амаль палову манет Гарошкаўскага скарбу. Практычна ўсе яны – 2 270 экз. – належаць да кароннай чаканкі *(табліца 4)*, і толькі дзве манеты 1620 г. адчаканены ў Рызе. Большасць польскіх паўтаракоў са скарбу з в. Гарошкі адчаканена ў 1622–1625 гг. Сярод каронных паўтаракоў варта адзначыць вельмі рэдкую манету без даты *(малюнак 1)*, а таксама манету з непрачаканеным рэверсам, якія не ўвайшлі ў статыстыку ў *табліцы 4*. Наяўнасць на паўтараку без даты герба Сас, які належаў вялікаму падскарбію кароннаму

Мікалаю Даніловічу, дае падставу меркаваць, што ён быў адчаканены паміж 1617 г. і 1625 г.

Каронныя траякі (98 экз.) прадстаўлены ў Гарошкаўскім дэпазіце выключна познімі выпускамі Кракаўскага манетнага двара, гэта можа сведчыць аб тым, што скарб мае адносна непрацяглы хранала-гічны інтэрвал паміж пачаткам фарміравання і захаваннем. Пра гэта будзе адзначана ніжэй.

1621 г. – 26 экз. (усе – Iger.K.21.1[4]);
1622 г. – 31 экз. (усе – Iger.K.22.1a);
1623 г. – 12 экз. (10 – Iger.K.23.1a, 1 – Iger.K.23.1c, 1 – няма ў Iger[5]);
1624 г. – 26 экз. (23 – Iger.K.24.1a, 3 – Iger.K.24.1b);
162x (1620–1624 гг.) – 3 экз.

Шостакі з'яўляюцца найбуйнейшымі наміналамі Рэчы Паспалітай (прынамсі, у захаванай частцы скарбу). Усе яны (46 экз.), як і траякі, адчаканены на Кракаўскім манетным двары: 1623 г. – 3 экз.; 1624 г. – 4 экз.; 1625 г. – 14 экз.; 1626 г. – 17 экз.; 1627 г. – 7 экз.; 16хх (1625–1627) – 1 экз.

Манеты Яна II Казіміра Вазы (1649–1668) прадстаўлены ў Гарошкаўскім скарбе вельмі сціпла. Іх усяго шэсць. Гэта два дарэформенныя літоўскія шэлягі 1652 г. і чатыры «барацінкі» – тры літоўскія (1664? г., 1665 г. і 1666 г.) і адна каронная з нечытэльнай датай. Нешматлікасць у скарбе медных шэлягаў Яна II Казіміра Вазы дае падставу меркаваць, што яны маглі апынуцца сярод перададзеных у музей манет выпадкова, пра што будзе ісці гаворка ніжэй.

Другое месца па колькасці экзэмпляраў у скарбе з в. Гарошкі займаюць манеты Шведскай Прыбалтыкі (1 549 экз.). Пераважаюць эмісіі Густава II Адольфа Вазы (1621–1632) – 1 254 экз., на другім месцы манеты Крысціны Аўгусты Ваза (1632–1654) – 289 экз., а эмісіі Карла Х Густава (1654–1660) прадстаўлены ўсяго трыма рыжскімі шэлягамі (1656 г., 1658 г. і 1659 г.).

У адрозненне ад манет Рэчы Паспалітай са складу Гарошкаўскага скарбу, сярод якіх шэляжныя манеты складаюць зусім невялікую частку (каля 4%), шэлягі, адчаканеныя пад шведскай акупацыяй у Рызе і Эльбінгу, складаюць каля чвэрці манет Шведскай Прыбалтыкі. Большасць з іх – манеты з іменем Густава II Адольфа (278 экз.), у тым ліку і тыя, што былі адчаканены пасля яго смерці ў 1632 г. *(табліца 5)*. Гэта пераважна шэлягі рыжскай чаканкі, а таксама манеты, адчаканеныя ў Эльбінгу, як з гарадской, так і з каралеўскай легендай.

Табліца 5

**Шэлягі з іменем Густава II Адольфа**

| | Рыжскія | Эльбінгскія (гарадскія) | Эльбінгскія (каралеўскія) | Ман. двор? |
|---|---|---|---|---|
| **1621** | 1 | | | |
| **1623** | 1 | | | |
| **1624** | 2 | | | |
| **1625** | 7 | | | |
| **1626** | 6 | | | |
| **1627** | 12 | | | |
| **1627?** | 1 | | | |
| **1628** | 18 | | | |
| **1628?** | 2 | | | |
| **162x** | 5 | | | |
| **1630** | 8 | 2 | | |
| **1630?** | 3 | 1 | | |
| **1631** | 16 | 5 | | |
| **1631?** | 2 | 1 | | 1 |
| **1632** | 27 | 4 | 1 | |
| **1632?** | 1 | 1 | 3 | |
| **1633** | 12 | 12 | | |
| **1633?** | 6 | 2 | 1 | |
| **1634** | 24 | | | 1 |
| **1634?** | 2 | 1 | | |
| **163x** | 23 | 5 | | |
| **16xx** | 39 | 12 | 2 | 5 |
| **Усяго** | **218** | **46** | **7** | **7** |

Сярод шэляжных манет рыжскай чаканкі маецца адзін даволі рэдкі экзэмпляр, адчаканены ў 1623 г. Манета была атрыбутавана Л.Д. Клокам як «паўтара шылінга», што, згодна з апошнім даследаваннем, з'яўляецца памылкай. Больш мэтазгодна лічыць гэтую манету шэлягам (інакш, «чорным шэлягам»), што пераканаўча, на пагляд аўтара, даказана Дзмітрыем Стараверавым і Уладзіславам Безпалькам [3].

Манеты рыжскай чаканкі пераважаюць і сярод шэлягаў Крысціны Аўгусты, прычым гэта ўжо не толькі прадукцыя гарадского манетнага двара (99 экз.), але і каралеўскага, на якім выпускаліся лівонскія шэлягі (2 экз.). Даволі шмат шэлягаў (22 экз.) і гарадской чаканкі Эльбінга, якія выпускаліся пры Крысціне з 1 633 г. да 1635 г. *(табліца 6)*.

Невялікай групай (8 экз.) прадстаўлены грошэны эльбінгскай чаканкі часу праўлення Густава II Адольфа – 6 манет 1629 г. і 2 манеты 1630 г.

Найбольш прадстаўнічую групу сярод эмісій Шведскай Прыбалтыкі складаюць драйпёлькеры – 1 121 экз. З іх 259 адчаканены ў Рызе, а 862 – у Эльбінгу. Сярод апошніх пераважную большасць складаюць манеты з каралеўскай легендай, у тым ліку 609 манет з іменем Густава II Адольфа *(табліца 7)*, 164 манеты Крысціны Аўгусты *(табліца 8)* і дзве манеты 1633 г. з нявызначаным эмітэнтам. Амаль усе рыжскія драйпёлькеры адчаканены пры праўленні Густава II Адольфа і толькі адзін (1644 г.) – пры праўленні Крысціны Аўгусты.

Драйпёлькеры з іменем Густава II Адольфа складаюць больш за 20% ад усіх манет скарбу. Асабліва цікавымі падаюцца манеты, якія адчаканены ў Эльбінгу ўжо пасля смерці гэтага караля, а ў першую

[4] *Тут і далей вызначэнне траякоў падаецца паводле каталога Тадэвуша Ігера [5].*
[5] *Манета належыць да тыпу Iger.K.23.1, але з легендай аверса •SIG•III•D:G:REX •POLO M•D L•, якая не апісана ў каталозе Т. Ігера.*

Табліца 6

**Шэлягі Крысціны Аўгусты**

| | Рыжскія | Лівонскія | Эльбінгскія (гарадскія) | Ман. двор? |
|---|---|---|---|---|
| 1634 | | | 4 | |
| 1634? | | | 1 | |
| 1635 | 30 | | 6 | |
| 1635? | 7 | | 1 | |
| 1636 | 10 | | | |
| 1637 | 3 | | | |
| 1638 | 5 | | | |
| 1638? | 1 | | | |
| 163x | 13 | | 5 | |
| 1640 | 1 | | | |
| 1641 | 2 | | | |
| 1643 | 1 | | | |
| 1645 | 1 | | | |
| 1647 | 1 | | | |
| 1648 | 1 | | | |
| 1649 | 1 | 1 | | |
| 1650 | | 1 | | |
| 165x | 1 | | | |
| 16xx | 21 | | 5 | 1 |
| **Усяго** | **99** | **2** | **22** | **1** |

Табліца 7

**Драйпёлькеры з іменем Густава II Адольфа**

| | Рыжскія | Эльбінгскія (гарадскія) | Эльбінгскія (каралеўскія) |
|---|---|---|---|
| 1622 | 46 | | |
| 1622? | 2 | | |
| 1623 | 86 | | |
| 1624 | 120 | | |
| 1624? | 3 | | |
| 1628 | | 1 | |
| 1629 | | 8 | |
| 162x | 1 | 1 | |
| 1630 | | 43 | |
| 1631 | | 16 | |
| 1632 | | 18 | 133 |
| 1632? | | 1 | |
| 1633 | | | 416 |
| 1633? | | | 17 |
| 1634 | | | 1 |
| 1635 | | | 8 |
| 1635? | | | 1 |
| 163x | | | 32 |
| **Усяго** | **258** | **87** | **609** |

чаргу надзвычай рэдкі драйпёлькер 1634 г. Сярод эльбінгскіх манет з каралеўскай легендай варта адзначыць і рэдкі экзэмпляр 1632 г., у якога ў яблыку лічба «24» перабіта на «60» *(малюнак 2)*.

Сярод эльбінгскіх драйпёлькераў Крысціны Аўгусты *(табліца 8)* адзначым два рэдкія экзэмпляры 1632 г. чаканкі.

Нарэшце, найбуйнейшымі наміналамі Шведскай Прыбалтыкі ў Гарошкаўскім дэпазіце з'яўляюцца траякі, адчаканеныя ў Эльбінгу, у тым ліку 12 – з каралеўскай легендай (1632 г. – 8 экз., 1633 г. – 2 экз., з нявызначанай датай – 2 экз.) і 2 траякі 1632 г. – з гарадской легендай.

Трэцяй па колькасці манет групай Гарошкаўскага скарбу з'яўляюцца эмісіі герцагства Прусія, якое знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Рэчы Паспалітай. Толькі на трох драйпёлькерах адлюстравана імя Іагана Жыгімонта (герцага Прусіі ў 1618–1619 гг.), але яны былі адчаканены ўжо пасля яго смерці (1620 г.). Усе астатнія манеты належаць да чаканкі Георга Вільгельма (сына Іагана Жыгімонта). Абсалютная большасць з іх – больш за 90% – драйпёлькеры *(табліца 10)*. Шэлягі *(табліца 9)* складаюць крыху больш за 9%, а манета наміналам у грош прадстаўлена ўсяго адным экзэмплярам (1633 г. чаканкі).

Яшчэ адну невялікую групу (8 экз.) у скарбе з в. Гарошкі складаюць памеранскія драйпёлькеры. Манеты герцагства Памераніі даволі рэгулярна сустракаюцца ў дэпазітах, падобных да Гарошкаўскага.

Табліца 8

**Драйпёлькеры Крысціны Аўгусты**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1632 | 2 | 1635 | 111 |
| 1634 | 30 | 1635? | 7 |
| 1633 або 1635 | 2 | 1632–1635 | 11 |



*Малюнак 2*

У разглядаемым скарбе прадстаўлены драйпёлькер Багуслава XIV, які адчаканены ў Дарлове (для Ругенвальдэ) у 1620 г., і сем драйпёлькераў чаканкі Ульрыха як біскупа Камінскага (1621 г. – 6 экз., 1622 г. – 1 экз.).

Табліца 9

**Шэлягі Георга Вільгельма**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1625 | 3 | 1623–1629 | 2 |
| 1627 | 7 | 1627 або 1629 | 1 |
| 1628 | 5 | 1630 | 5 |
| 1629 | 7 | 1630? | 1 |
| 1629? | 3 | 1633 | 5 |
| Усяго | 39 | | |

Табліца 10

**Драйпёлькеры Георга Вільгельма**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1621 | 16 | 1626? | 1 |
| 1622 | 52 | 1627 | 25 |
| 1623 | 33 | 1627? | 1 |
| 1624 | 57 | 162x (1621–1624) | 5 |
| 1625 | 77 | 162x (1624–1628) | 4 |
| 1625? | 1 | 1633 | 9 |
| 1626 | 79 | | |
| Усяго | 360 | | |

Нарэшце, апошнюю, зусім невялікую групу складаюць так званыя «макукіны» – 2-рэалавыя манеты Іспаніі, выпушчаныя ў самой метраполіі. Дзве з іх належаць да эмісій Філіпа III (1598–1621) і адчаканены ў 1599–1609 гг. у Гранадзе і Таледа. Яшчэ адна манета можа належаць як да чаканкі Філіпа II (1554–1598), так і Філіпа III. Месца яе чаканкі не чытаецца.

Асобную групу ў Гарошкаўскім дэпазіце складаюць фальшывыя манеты. На дадзены момант аўтару артыкула разам з Раманам Крыцуком удалося выявіць шэсць такіх манет, але далейшая дэтальная апрацоўка скарбу можа павялічыць гэтую лічбу. Тры манеты з'яўляюцца падробкамі эмісій Рэчы Паспалітай. Гэта падробкі пад:

- літоўскі шэляг Жыгімонта III Вазы з неразборлівай датай;
- каронны грош Жыгімонта III Вазы 1624 г. *(малюнак 3)*;



*Малюнак 3*

- каронную «барацінку» Яна II Казіміра Вазы з неразборлівай датай.

Яшчэ тры манеты з'яўляюцца падробкамі пад шэлягі Шведскай Прыбалтыкі:

- Густаў II Адольф Ваза. Эльблёнг (каралеўская легенда), 1632?;
- Густаў II Адольф Ваза. Рыга, з фантастычнай датай [16]35;
- Крысціна Аўгуста Ваза. Рыга, 1638.

У завяршэнне апісання манет Гарошкаўскага скарбу трэба адзначыць, што некаторыя з іх маюць невялікія круглыя адтуліны каля краю, якія сведчаць, хутчэй за ўсё, пра колішняе выкарыстанне гэтых манет у якасці падвесак. Такіх манет у дэпазіце няшмат – усяго 14: каронныя паўтаракі Жыгімонта III, датаваныя 1620 г., 1622 г. (4 экз.), 1623 г. (2 экз.) і 1624 г.; каронныя траякі Жыгімонта III, датаваныя 1624 г. (2 экз.); рыжскія драйпёлькеры Густава II Адольфа, датаваныя 1622 г. і 1623 г.; эльбінгскі драйпёлькер Крысціны Аўгусты, датаваны 1634 г., і прускі драйпёлькер, датаваны 1626 г. Яшчэ адна манета – каронны паўтарак Жыгімонта III 1625 г. – таксама мае адтуліну, але яна неахайна прабіта вострым прадметам (вастрыём нажа?) і не падобна на адтуліну для падвешвання.

Асаблівую цікавасць выклікае тара, у якой былі захаваны манеты. У музей перададзены толькі рэшткі алавянай (?) пасудзіны, што знаходзіліся ў вельмі дрэнным стане. Сярод фрагментаў, якія захоўваюцца сёння ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, найбольшую цікавасць выклікаюць адносна вузкая гарлавіна, унутраны дыяметр якой складае 48–50 мм, і невялікае вушка (43x26x18 мм). Гэтыя фрагменты дазваляюць меркаваць, што манеты былі схаваны ў металічную флягу ці біклагу. На жаль, яе аб'ём ужо немагчыма вызначыць па прычыне адсутнасці большай часткі фрагментаў пасудзіны, але можна меркаваць, што яна павінна была быць дастаткова вялікай, каб змясціць больш за 4,5 тыс. манет. Цалкам магчыма, што ў металічную пасудзіну былі змешчаны не ўсе манеты, а толькі меншыя па памеры. Можна выказаць гіпотэзу, што сярод разрабаванай часткі скарбу былі буйнейшыя за паўтаракі і драйпёлькеры наміналы, напрыклад талерныя манеты або орты. На жаль, менавіта такія манеты па прычыне сваёй атрактыўнасці ў першую чаргу робяцца аб'ектамі «асаблівай увагі» нядобрасумленных знаходчыкаў.

Скарбы з алавянай тарай – дастаткова рэдкая з'ява. Варта прызнаць, што гэтае пытанне яшчэ недасткова прапрацавана, але аўтару пакуль не ўдалося выявіць у беларускіх скарбах тару, падобную да гарошкаўскай. Бліжэйшыя аналогіі вядомы сярод украінскіх дэпазітаў. Так, скарб сярэдзіны XVII ст. з Гарадзішча Чарнухынскага раёна Палтаўскай вобласці быў схаваны ў алавяную флягу з геральдычнай выявай [4, с. 69], а скарб канца XVII ст. з Лелюхіўкі Новасанжарскага раёна Палтаўскай вобласці знаходзіўся ў алавянай пасудзіне кшталту бітона з накрыўкай [2, с. 88][6].

Манеты, памер якіх перавышаў унутраны дыяметр гарлавіны флягі, маглі быць наўпрост пакла-

[6] *Выказваю шчырую падзяку Андрэю Бойка-Гагарыну і Раману Крыцуку за дапамогу ў пошуку аналогій.*

дзены ў скрыню (куфэрак?) з драўляных дошчачак. Але, на жаль, гэта толькі гіпотэза, якую мы ўжо не ў стане пацвердзіць ці абвергнуць.

Нягледзячы на тое, што для буйных скарбаў дата іх тэзаўрацыі звычайна вызначаецца без праблем, для Гарошкаўскага дэпазіту гэта зрабіць няпроста. Па-першае, трэба вызначыць час фарміравання комплексу манет. Прыцягвае ўвагу зусім нязначная прысутнасць у скарбе з Гарошак ранніх эмісій Жыгімонта III Вазы (усяго некалькі манет першага дзесяцігоддзя XVII ст.). Прычым гэта датычыць як шэляжнай манеты, так і траякоў, якія выпускаліся ў канцы XVI ст. – пачатку XVII ст. дастаткова значнымі тыражамі. Такім чынам, можна сцвярджаць, што актыўная фаза накаплення манет Гарошкаўскага дэпазіту пачалася не раней за 1620-я гг. З улікам таго, што эмісіі Яна II Казіміра Вазы, познія выпускі Крысціны Аўгусты Ваза, а таксама шэлягі Карла X Густава прадстаўлены вельмі сціпла, можна дадаць, што гэта фаза завяршылася яшчэ ў 1640-я гг. Хутчэй за ўсё, манеты паступалі ў комплекс і пазней, але ў меншай колькасці.

Для вызначэння часу тэзаўрацыі мы павінны, безумоўна, абапірацца на малодшую манету, то бок літоўскую «барацінку» 1666 г. Але прысутнасць у скарбе медных шэлягаў Яна II Казіміра Вазы падаецца выпадковай. Цалкам магчыма, што гэтыя самыя распаўсюджаныя на тэрыторыі Беларусі манеты знаходзіліся ў слоі зямлі побач са скарбам. Таму больш мэтазгодным падаецца выкарыстоўваць у якасці датуючых манеты 1650-х гг. – дарэформенныя шэлягі Яна II Казіміра Вазы, а таксама рыжскія шэлягі Карла X Густава. У любым выпадку, «выпадзенне» Гарошкаўскага дэпазіту мы смела можам звязваць з катастрафічнымі падзеямі 1650–1660-х гг., калі на тэрыторыі Міншчыны вяліся актыўныя баявыя дзеянні.

Яшчэ адным важным пытаннем з'яўляецца вызначэнне характару і прыналежнасці скарбу з в. Гарошкі. Гэты дэпазіт яўна не належыць да «элітарных» скарбаў, бо амаль цалкам складаецца з разменнай манеты. У той жа час ён вылучаецца з большасці скарбаў сярэдзіны XVII ст., бо складаецца пераважна з паўтаракоў і драйпёлькераў, а не шэляжнай манеты. Калі паспрабаваць пералічыць кошт захаванай часткі скарбу на грашовы лік, то атрымліваецца даволі значная сума – больш за 6,5 тыс. грошаў (або каля 220 злотых). На думку аўтара, Гарошкаўскі скарб варта аднесці да так званых гандлёвых скарбаў. Гэтыя манеты маглі належыць якому-небудзь гандляру, які пацярпеў (загінуў?) падчасвайны Рэчы Паспалітай з Рускім Царствам.

Навуковая апрацоўка скарбу з в. Гарошкі Мінскага раёна будзе працягвацца. Ён, безумоўна, з'яўляецца адным з самых каштоўных захаваных беларускіх скарбаў. Асабліва цікавым і перспектыўным, на погляд аўтара, будзе дэтальны аналіз паўтаракоў Рэчы Паспалітай і драйпёлькераў Шведскай Прыбалтыкі, які дазволіць значна ўзбагаціць веды пра гэтыя манеты і дапамагчы ў стварэнні грунтоўных каталогаў менавіта па гэтых наміналах.

***Бібліяграфічны спіс:***

1. *Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1774 (Навагрудскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 140. Арк. 21.*
2. *Зразюк, З.О. Скарб західноєвропейських на російських монет XVI – поч. XVIII ст., знайдений біля с. Лелюхівка Новосанжарського р-ну Полтавської обл.: тематич. зб. науков. праць / З.О. Зразюк, Н. Стрижакова // Музей та його колекції. – Київ: «ІІІ, ЛТД», 2003. – С. 88–95.*
3. *Старовєров, Д.А. Від півгроша до шилінга. «Чорні» шилінги Риги 1623 року / Д.А. Старовєров, В.В. Безпалько // Львівські нумізматичні записки. – № 16–17. – С. 29–32.*
4. *Шерстюк, В.В. Монетні скарби середини XVII ст. з Полтавщини / В.В. Шерстюк // Актуальні проблеми нумізматики у системі спеціальних галузей історичної науки: тези доповідей IV Міжнародної науково-практичної конференції, Кіровоград – Київ – Переяслав Хмельницький, 22–23 червня 2016 р. – С. 69–71.*
5. *Iger, T. Katalog trojaków polskich / T. Iger. – Warszawa, 2008.*

## The Hoard of XVII Century from the Village of Garoshki, Minsk District, from the Collection of the National Historical Museum of the Republic of Belarus

**Vital SIDAROVICH,** *the Belarusian State University, Head of Educational Laboratory of Museum Studies, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: witał.sidarowicz@gmail.com.*

**Abstract.** *The hoard of Garoshki is one of the largest coin deposits of the XVII century in Belarus. It consists mainly of poltoraks of the Polish-Lithuanian Commonwealth and dreipųlkers of the Swedish Baltic States and Prussia. Quite a significant part of the treasure consists of shillings, the later of which are dated 1650-1660 yrs. Denominations larger than one and a half of groat are represented in a relatively insignificant amount. This suggests that the treasure belonged to a merchant, and its "hiding" is due to the war between the Polish-Lithuanian Commonwealth and the Russian Empire. The scientific research of the hoard of Garoshki will be continued. Particularly interesting and promising is the detailed analysis of poltoraks and dreipųlkers, which will make it possible to supplement the knowledge of these coins and clarify their typology.*